# ДАСЦІПНА, ТРАПНА, ВОБРАЗНА: УЗБАГАЧЭННЕ ФРАЗЕАЛАГІЧНАГА ЗАПАСУ ВУЧНЯЎ І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

Падручнікі «Літаратурнае чытанне» для пачатковых класаў змяшчаюць мастацкія тэксты, багатыя на фразеалагізмы. Гэта дае магчымасць настаўніку арганізаваць працу, накіраваную на развіццё разумення малодшымі школьнікамі сэнсу фразеалагізмаў у структуры літаратурнага твора, на фарміраванне ў вучняў уменняў знаходзіць фразеалагізмы і дарэчна выкарыстоўваць іх у вусным і пісьмовым маўленні.

Прааналізаваўшы сабраныя з літаратурных тэкстаў фразеалагічныя адзінкі, мы распрацавалі сістэму практыкаванняў, накіраваную на ўзбагачэнне слоўніка вучняў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі фразеалагізмамі.

**Практыкаванні на параўнанне фразеалагічных адзінак са свабоднымі словазлучэннямі**

1. *Прачытайце сказы. Знайдзіце, у якім сказе выкарыстаны фразеалагізм, а ў якім – свабоднае словазлучэнне. Падумайце, чым яны адрозніваюцца.*

Хлопчык махнуў бацьку рукой і пабег яму насустрач. – Бацька даўно ўжо махнуў рукой на жыццё.

2. *Чым адрозніваюцца фразеалагізмы ў наступных сказах ад свабодных словазлучэнняў? Аргументуйце свой адказ.*

Я не знайшоў сабе месца і стаяў у дзвярах. – Бацька не знаходзіў сабе месца ад хвалявання.

Хлопчык прыкусіў язык і заплакаў. – Ён чуць не прагаварыўся, але своечасова прыкусіў язык.

Вёска наша не за гарамі, а вунь за тым лесам. –Лета ўжо не за гарамі.

3. *Складзіце з дзвюх груп слоў фразеалагізмы і паспрабуйце растлумачыць іх значэнні.*

| | |
|---|---|
| Язык | задзіраць |
| Нос | апусціць |
| Галаву | павесіць |
| Рукі | развязаць |

4. *Прачытайце сказы. У якіх з іх словазлучэнні* <u>*закасаўшы рукавы*</u> *і* <u>*прыкусіць язык*</u> *з'яўляюцца свабоднымі, а ў якіх – фразеалагізмамі. Аргументуйце свой адказ.*

Брат заўсёды працуе з душою, закасаўшы рукавы. Мама мыла бялізну, закасаўшы рукавы. Падаючы, Міхась прыкусіў язык. Баючыся выдаць тайну брата, Міколка прыкусіў язык.

***Практыкаванні на знаходжанне фразеалагізмаў у мастацкіх тэкстах***

1. *Прачытайце сказы, узятыя з апавядання В. Гурскага «Верныя сябры» Знайдзіце ў іх фразеалагізмы і выпішыце ў сшытак.*

Блізка ад яго, пад ядлоўцавым кустом, пасяліўся Вожык. Памяркоўны звярок, нікому вока не запарушыў.

Заяц стаў на заднія лапкі і ўбачыў драпежніка, які прытаіўся ў кустах.

– Уцякай, Вожык! – крыкнуў ён і даў драпака.

*2. Выпішыце прыказкі, у складзе якіх ёсць фразеалагізмы.*

Шануй бацьку з маткаю: другіх не знойдзеш.

На языку – хоць куды, а на працы – нікуды.

Птушка рада вясне, а дзіця – маці.

Кнігі чытаеш – свет адкрываеш.

Адзін раз зманіш – другі не павераць.

Не таму слава, хто на язык лёгкі, а таму, хто ў справе стойкі.

А яму і не бяда: усё нібы з гусі вада.

Чалавек без сяброў, што дрэва без каранёў.

*3. Прачытайце сказы, знайдзіце ў іх фразеалагізмы. Запішыце іх у сшытак.*

Матуля паглядзела ў твар сыну. У вачах Вожыка бегалі нейкія агеньчыкі. Ён хітрыў – вельмі ж Вожыку хацелася быць дарослым (П. Ткачоў. Хітрун).

«Нешта ж прыйшло яму ў галаву», – падумала маці (М. Янчанка. Сустрэча з бацькам).

Смяецца Янка. І ў Міколкі вочы загарэліся. Ніхто і ніколі яго так высока не падкідваў (М. Янчанка. Сустрэча з бацькам).

Зноў памаўчаў, паслухаў і закрычаў з усяе сілы:

– Ермакоў, Уладзімір! Татка! (М. Янчанка. Сустрэча з бацькам).

Хіба я цябе ў барановы рог скручу, як сцісну, то аж табе вылезуць вочы (Казка «Сварба»).

Аж іскры пасыпаліся з вачэй у ваўка (Казка «Лёгкі хлеб»).

Аж разрываецца ад крыўды сэрца,
Куды ні глянь – разбітыя бутэлькі, шклянкі
Ды ад кансерваў розныя бляшанкі... (У. Правасуд. Вадзянік і Лесавік).

**Практыкаванні на акрэсліванне значэння фразеалагічных адзінак**

*1. Высветліце значэнне фразеалагізмаў, якія сутрэліся ў апавяданні У. Ягоўдзіка «Жаўрук». Запішыце фразеалагізмы і іх значэнне ў сшытак.*

А ў самога гаспадара кашуля на спіне – хоць выкручвай ад салёнага поту.

Прывітаўся чараўнік з хлебаробам. Слова за слова – разгаварыліся.

*2. Як вы разумееце значэнне наступных фразеалагізмаў, выкарыстаных у казцы «Музыка-чарадзей»: натапыраць вушы, сэрца рэзаў, як костка ў горле, са свету звесці, хоць гаць гаці, (разбегліся) хто куды, вочы гараць? Знайдзіце ў тэксце апавядання сказы з гэтымі фразеалагізмамі. Як яны дапамагаюць ахарактарызаваць герояў твора?*

Бывала, пасучы валоў, зробіць з лазы дудачку ды як зайграе, дык валы скубці траву перастаюць – натапыраць вушы ды слухаюць.

Доўга хадзіў так па свеце музыка, весяліў добрых людзей, а ліхім панам без нажа сэрца рэзаў, бо куды ён ні прыйдзе, там людзі перастаюць паноў слухаць. Стаў ён ім упоперак дарогі як костка ў горле.

Надумаліся паны са свету яго звесці. Прывялі панічы музыку ў палац. Бачыць ён: панічоў і паненак там хоць гаць гаці.

Наладзіў ён скрыпку, ударыў смычком па жывых струнах – і тут адразу ўсё пекла ў шчэпкі разляцелася, а чэрці з ведзьмамі разбегліся хто куды.

*4. Падбярыце фразеалагізм, які сцісла выражае асноўны сэнс апісанага.*

Гэта цяпер розных талерак, спадачкаў, місачак, келіхаў – усе шафы і камоды набіты, а ў той час… (І. Муравейка. Лыжкай па лбе).

*5. Знайдзіце ў тэксце апавядання М. Пазнякова «Клён» усе фразеалагізмы, высвятліце іх значэнне па слоўніку і запішыце ў сшытак.*

Надсек у адным месцы, але сок не капаў, а сцякаў па ствале. Надсек у другім месцы – атрымалася лепш, падставіў слоік. Пайшоў у хату. Чакаю, пакуль набяжыць хоць трохі кляновіку. Ды тут бацька прыйшоў з працы. Гляджу і вачам сваім не веру: нясе ў руках мой пусты слоік. Сэрца ў мяне нібы абарвалася. Дасталося мне тады на арэхі.

*6. Выпішыце са сказаў у сшытак фразеалагізмы. Растлумачце іх значэнне.*

Яны (ногі) самі – хлопчык і вокам не паспеў міргнуць – прынеслі Юру дадому (В. Гарбук. Незнарок і знарок).

Зноў кінула позірк на Сяргейку і разрэзала ачышчанае яечка на дзве частачкі (І. Муравейка. Адно яечка на дваіх).

Ды я, брат, знаю чароўнае слова. Яно як рукой стому здымае (М. Даніленка. Чароўнае слова).

Прыбяжыш да клёна, а пад ім такі рознакаляровы дыван – вачэй не адарваць! (М. Пазнякоў. Клён).

А жабы, гледзячы на бурбалкі, зноў завялі сваю валынку з катрынкай (У. Караткевіч. Жабкі і чарапаха).

– Ну так, – пахмурнее Калючык, – альбо сцяна павінна быць бясконцай, альбо за ёй – бясконцасць, якой няма канца-краю (А. Масла. Калючык і космас).

**Практыкаванні на развіццё ў малодшых школьнікаў умення замяняць фразеалагізмы свабоднымі словазлучэннямі**

*1. Прачытайце сказы. Замяніце падкрэсленыя словы фразеалагізмамі. Што змянілася? Сказы з фразеалагізмамі запішыце.*

Да лесу <u>блізка</u> (М. Янчанка. А таму!).

А ты, Змітрок, пэўна, <u>гультаяваў</u> (М. Янчанка. А таму!)

Вожык ляжаў ціха-ціха, ад страху нават і дыхаць перастаў. А потым, калі крокі дзяўчынкі заціхлі, разгарнуўся і <u>вельмі хутка</u> пабег дахаты (П. Ткачоў. Хітрун).

А снежная бель <u>асляпляла</u>, і на сэрцы ад гэтага рабілася светла і радасна (І. Грамовіч. Выпаў снег).

<u>Даведка</u>: адбірала вочы, рукой падаць, што меў сілы, варон лічыў.

2. *Прачытайце ўрывак з верша А. Русака «Мой край». Падбярыце фразеалагізмы, якія падыходзіць па сэнсе.*

Куды ні глянь – лясы шумяць,
цвіце за полем гай,
а поле – … .
І гэта ўсё – мой край.

… Жыве, працуе мой народ
ці ў снежань, ці ў май,
і харашэе ….
мой родны вольны край.

3. *Замяніце падкрэсленыя фразеалагізмы свабоднымі словазлучэннямі, запішыце сказы.*

А яму хоць бы што: не слухае ні бацькі, ні людзей (Казка «Недалікатны сын»).

Маўчыць бацька як вады ў рот набраўшы (Казка «Недалікатны сын»).

«Паслухай, любая Пчала, –
Сказала Ружа неяк ранкам,
– Аблётала ты ўсю палянку,
На розных кветках пабыла,
А на мяне і ўвагі не звярнула (У. Корбан. Пчала і Ружа).

4. *Акрэсліце сэнс фразеалагізма адным словам і складзіце з гэтым фразеалагізмам адзін сказ.*

Бач, які герой знайшоўся! Сам кату па пяту, а распараджаецца.

Тыя мясціны ў лесе мой сябар ведаў як свае пяць пальцаў.

Юра і ахнуць не паспеў – дзын (В. Габрук. Незнарок і знарок).

5. *Прачытайце сказы. Які са сказаў, на вашу думку, з'яўляецца больш выразным, вобразным? Растлумачце, чаму вы так лічыце.*

А Воўку вельмі спаць хочацца. – А ў Воўка вочы зліпаюцца.

– Не хваліцеся, абое вы рабое! – Не хваліцеся, аднолькавыя вы!

6. *Прачытаце сказы. Замяніце падкрэсленыя словы (словазлучэнні) фразеалагізмамі. Што змянілася? Сказы запішыце.*

Вавёрка ўздыхнула. Паглядзела па баках (Вавёрка піша сачыненне).

Цвёрда запомні: хоць сто матываў іншых знай, а песняй роднаю, мой любы, не пагарджай! (Э. Валасевіч. Шпачыны канфуз).

Мяккая пярына
Асляпляе,
Белая раўніна –
Бясконцая (Я. Колас. Зіма).

А калі глянуў яму ў вочы, то ўбачыў у іх столькі ўдзячнасці, што азмрочанасць яго зусім знікла (Н. Мацяш. Залатое сэрца).

Нарэшце яна (Лужына) так раздурэлася, што абліла Юру поўнасцю (В. Гарбук. Незнарок і знарок).

Даведка: вочы адбірае, з галавы да ног, зарубі сабе на дзюбе, як рукой зняло, ні канца ні краю, стрэліла вачанятамі.

**Практыкаванні на падбор сінонімаў і антонімаў да фразеалагічных адзінак**

1. *Прачытайце сказы, знайдзіце ў іх фразеалагізмы. Падбярыце да іх з даведкі фразеалагізмы-сінонімы. Запоўніце табліцу ў сшытку.*

А яго дачка Сябелюбка ўцякла за трыдзевяць зямель у трыдзясятае царства (Н. Мацяш. Залатое сэрца).

Кончыла спяваць, глядзіць – а рака і след прастыў (Ганарыстая варона).

Нібы шар зямны, паверце,
Ходзіць кругам галава... (У. Мазго. Суседзі па сусвеце).

Даведка: на краі свету, як ветрам здзьмула, галава ходырам ходзіць, як і не было, за дзясятай гарой, толькі і бачылі, за светам, як вадой змыла, галава кружыцца.

| Фразеалагізм з тэксту | Фразеалагізм-сінонім |
|---|---|
| І след прастыў | Толькі і бачылі, як вадой змыла, як ветрам здзьмула, як і не было |
| За трыдзевяць зямель | За дзясятай гарой, за светам, на краі свету |
| Ходзіць кругам галава | Галава кружыцца, галава ходырам ходзіць |

2. *Прачытайце верш, знайдзіце ў ім фразеалагізм. Падбярыце да яго фразеалагізмы-антонімы.*

Як неслі вечарам грыбоў
(а іх – пад ручкі ў кошыках!),
ля трох разгалістых дубоў
убачылі мы вожыка.
Упаў у яму ля лаўжа
і, выбрацца не змогшы,
на дне прыцішаны ляжаў,
да голачкі прамокшы.
Малы – змясціла даланя!
І нездарма знямога
ў яме той на схіле дня
зваліла з ног малога. (Г. Пашкоў. Выратаванне Вожыка).

Даведка: падымаць на ногі, паставіць на ногі.

*3. Знайдзіце фразеалагізм. Ці можна яго замяніць наступнымі выразамі: без агляду, на ўсе ногі, што ёсць духу, як жару ўхапіўшы. Свой адказ аргументуйце.*

Вожык ляжаў ціха-ціха, ад страху нават і дыхаць перастаў. А потым, калі крокі дзяўчынкі заціхлі, разгарнуўся і што меў сілы пабег дахаты (П. Ткачоў. Хітрун).

4. *Параўнайце сказы, растлумачце сэнс выдзеленых фразеалагізмаў. Падобныя ці розныя па сваім сэнсе гэтыя сказы? Свой адказ аргументуйце.*

Пірог – **пальчыкі абліжаш**. – Пірог – есці не захочаш.

Падняўся бацька **ні свет ні зара**. – Падняўся бацька пасля трэціх пеўняў.

*5. Запішыце значэнне фразеалагізмаў як гром з яснага неба, як снег на галаву, адкуль ні вазьміся. Што агульнага ў іх значэнні? Ці можна назваць гэтыя фразеалагізмы сінанімічнымі?*

**Практыкаванні на развіццё ў малодшых школьнікаў навыку выкарыстання вывучаных фразеалагізмаў у вусным і пісьмовым маўленні**

*1. Складзіце невялікае апавяданне на тэму «Майстар сваёй справы», выкарыстоўваючы фразеалагізмы.*

*2. Перакажыце тэкст казкі «Музыка-чарадзей», выкарыстоўваючы фразеалагізмы, якія ў ёй сустракаюцца.*

*3. Дапішыце фразеалагізмы, выбраўшы патрэбнае слова ці форму слова. Аргументуйце свой выбар.*

З (мышыны, гулькін) нос; рабіць з (мухі, чарапахі) слана; не ў сваёй (каструлі, талерцы); трымаць (нос, вуха) востра; сем пятніц на (год, тыдзень).

*4. Знайдзіце памылкі ў сказах і выпраўце іх. Запішыце выпраўлены варыянт у сшытак.*

Пасля абеду хлопчык зноў глянуў у акно і нагам сваім не паверыў: рэдкія сняжынкі кружыліся ў паветры (Я. Галубовіч. Андрэйка-памочнік).

Узлаваўся Мароз Чырвоны Нос на селяніна, але ніякай парады даць яму не можа (Два Маразы).

«Трэба хутчэй будаваць кармушку!» – падумаў хлопчык. І ў суботу з бацькам яны ўзяліся за сякеру (Т. Мушынская. Ветлівая сінічка).

Вечарам да іх завітала бабка Агата. Акінула коўдрай хату, прысела на ўслон і спытала:

– А дзе ж, Андрэйка, памочнік мой? (Я. Галубовіч. Андрэйка-памочнік).

*5. Складзіце невялікую казку «Восень у лесе», выкарыстоўваючы фразеалагізмы.*

**Практыкаванні на фарміраванне ў малодшых школьнікаў умення выкарыстоўваць фразеалагізмы ў маўленні без мэтавага задання настаўніка**

*1. Падрабязна перакажыце беларускую народную казку «Недалікатны сын».*

*2. Апішыце паводзіны цяцеркі з апавядання У. Мяжэвіча «Цяцерка».*

*3. Разгледзьце ілюстрацыі да тэксту апавядання В. Хомчанкі «Елка з белымі кветкамі» і, абапіраючыся на іх, складзіце пераказ.*

Такім чынам, праца з падобнага тыпу практыкаваннямі накіравана на ўзбагачэнне слоўніка вучняў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі фразеалагізмамі, якія сустракаюцца ў мастацкіх творах, на фарміраванне ў малодшых школьнікаў умення дарэчна выкарыстоўваць фразеалагічныя адзінкі ў вусным і пісьмовым маўленні.